SSN1995-0322. СОЦІУМ. Альманах соціальної історії. Випуск 15-16. С. 359–374

УДК: 316.346:94(476)"15/16"

***Наталля Сліж***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
БІП– Інстытут Правазнаўства, Гродзенскі філіял
(Гродна, Беларусь, magvita@gmail.com)
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9907-9761

# ДЗЕЦІ Ў СЯМ' І ГАРАДЗЕНСКІХ МЯШЧАН У XVI–XVII стст.

***Анотація***. Історія дитинства в міщанських родинах Гродна – практично недосліджена тема. Однак грунтовно висвітлити дану тему неможливо через відсутність достатньої кількості джерел. З точки зору магдебурзького права до категорії неповнолітніх відносилися особи, які не досягли 21 року. Народження дітей було важливою функцією міщанської родини. Релігія і законодавство вчинили усе можливе, аби законними вважалися діти, народжені у вінчаному шлюбі. Засвідчення доброго походження було необхідним для посідання урядів у магістраті і для вступу в цех. Відсутні родинні портрети міщан. Збереглися окремі анонімні зображення дітей за XVI–XVII ст. Наявні матеріали дають можливість зробити наступні висновки: дітям намагалися дати освіту відповідно до майнового стану, бо для міщан професія мала важливе значення як джерело заробітку; долі дітей та їх здоров'я турбувало батьків; у небезпечних ситуаціях вони робили усе, аби їх врятувати; діти виховувалися не тільки у своїх сім'ях, але й могли потрапити на виховання до іншої родини; у міщанському середовищі подібно існував інститут опіки, він був необхідний для осиротілих дітей, опікуни доглядали їх і їхній маєток до повноліття; обов'язком батьків вважалося виховати дітей, заключити шлюб, наділити їх майном; від дітей очікували догляд за батьками у старості, належне поховання і пам'ять після смерті. Невиконання дітьми обов'язків відносно батьків каралося позбавленням або відстороненням від майна.

***Ключові слова***: діти, виховання, освіта, міщани, Гродно, XVI-XVII ст.

Гісторыя дзяцінства даўно ўжо прыцягвае ўвагу ў сусветнай гістарыяграфіі[1]. Дзякуючы новым метадалагічным падыходам у навуковае кола быў уведзены гэты цмяны бок чалавечага жыцця. Пытанню дзяцінства ў сям'і гарадзенскіх мяшчан не прысвечана спецыяльнай працы. Таму дадзенае даследаванне з'яўляецца актуальным, якое асвятляе асобную сферу з гісторыі сям'і. Аднак гэта тэма даволі складаная для вывучэння па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, бо даволі

[1] Гл.: Арьес Ф. *Ребёнок и семейная жизнь при Старом порядке*. Екатеринбург, 1999; Żołądź-Strzelczyk D. *Dziecko w dawnej Polsce*. Poznań, 2002 і інш.

абмежавана прадстаўлена ў крыніцах. Нават у шляхецкіх дзённіках сустракаюцца толькі асобныя факты па нараджэнню, смерці ці шлюбу дзяцей, а іх штодзённае жыццё амаль не прадстаўлена на старонках. Яшчэ больш складаным уяўляецца даследаванне дзяцінства ў гарадах. Па гісторыі Гародні па XVI ст. захаваліся ўрывачныя дакументы, а па XVII ст. – чатыры магістрацкія кнігі[2]. Некаторыя моманты з прыватнага жыцця мяшчан, звязаныя з хваробамі, адлюстраваліся ў „Зборы цудаў Маці Божай Студэнцкай”[3]. Дзённікаў і асабістай перапіскі мяшчан намі не выяўлена.

У сувязі з абмежаванай колькасцю крыніц гісторыя дзяцінства ў Гародні прадстаўлена не цалкам. У поўнай меры не магчыма прадставіць падрыхтоўку да нараджэння дзіця, хрышчэнне, гульні дзяцей, уключэнне іх у гаспадарку, асаблівасці выхавання хлопчыкаў і дзяўчат і іншыя сферы з жыцця дзяцей. Калі шляхта мела ідэалы і вобразы, якія былі апісаны ў літаратуры, то падобных твораў з асяроддзя гарадзенскіх мяшчан не захавалася. Аднак заможныя мяшчане, якія мелі кантакты са шляхтай, пераймалі рысы шляхецкай культуры. У дадзенай працы прадстаўлены матэрыялы пра пачатак дзяцінства, гульні, выхаванне ў чужой сям’і, апеку, клопат дзяцей у небяспечных сітуацыях, размеркаванне спадчыны.

***Пачатак дзяцінства***. З пункту гледжання магдэбургскага права да катэгорыі непаўналетніх адносіліся асобы, якія не дасягнулі 21 год (Вейхбільд, арт. XLVIII). Да гэтага перыяду яны знаходзіліся пад апекай бацькоў ці апекуноў. Асобы мужчынскага полу станавіліся самастойнымі і паўнасправўнымі, а жаночага полу – заўсёды былі ў залежнасці ад бацькоў, мужа, апекуноў. Найбольш цяжка прасачыць падзел дзяцінства ўнутры гэтага перыяду і павелічэнне адказнасці ў сувязі з узростам.

Адносна дзяцей у крыніцах выкарыстоўваліся наступныя словы і выразы: „dzieci”, „dziatki”, „niedorosły”, або адзначалася, што ім трэба дарасці да паўналецця: „do wzrostu lat”, „lat dorosłych”[4]. У гэтую катэгорыю ўключаліся ўсе дзеці да 21 год. Аднак у тэстаментах бацькі, канечне, ужывалі слова „дзеці” незалежна ад іх узросту.

Калі сыходзіць з казання гарадзенскага ксяндза Барталамея Вышамерскага, якое было прамоўлена на пахаванні мяшчанкі Юстыны Шульцаўны ў бернардынскім касцёле 10 сакавіка 1674 г., то перыяд дзяцінства асацыяваўся з чысцінёй і нявіннасцю. Дзяўчына правяла большую частку жыцця ў паненскім стане, а ў шлюбе са злотнікам Крыштафам Фіселем – толькі 9 месяцаў[5]. Гэтае меркаванне было ўласціва для каталіцкага касцёла.

Нараджэнне дзяцей было важнай функцыяй мяшчанскай сям’і. Рэлігія і заканадаўства зрабілі шмат намаганняў, каб законнымі лічыліся дзеці народжаныя ў венчаным шлюбе. Пасведчанне ад добрым паходжанні было неабходна для займання

[2] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далі – НГАБ). Ф. 1761, воп. 1, спр. 1–3; ф. 1800, воп. 1, спр. 1.

[3] *Sumaryusz cudow i łask znakomitszych Nayswietszey Maryey Panny Studentskiey Kongregacyi Grodzienskiey pod tytułem Annuntiationis*. Wilna, 1686.

[4] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 129 адв., 130, 152 адв., 153, 153 адв., 154, 294 і інш.

[5] Vilniaus universiteto biblioteka. Rankraščių skyrius. F. 3-2263. L. 58–61v.

пасады ў магістраце і для ўступлення ў цэх. Заканадаўства адрознівала дзяцей народжаных у шлюбе і паза шлюбам. Права на спадчыну мелі законнанароджаныя дзеці па прычыне законнага шлюбу і па прычыне нараджэння (Вейхбільд, арт. III; Саксонскае Люстра, ч. I, арт. 48, 51). Аднак у горадзе былі выпадкі нараджэння пазашлюбных дзяцей. У візітацыі 1655–1661 гг. Фарнага касцёла адзначалася, што жанчына забіла сваё дзіцё, народжанае паза шлюбам[6].

Як праходзіў перыяд цяжарнасці ў мяшчанкі, і як яна нараджала на гэтыя пытанні цяжка адказаць. У Гародні былі аптэкі[7], працавалі цырульнікі і дактары[8]. Пра працу павітух у горадзе за гэты перыяд у дакументах не атрымалася выявіць інфармацыю.

У магістрацкай кнізе зафіксаваны выпадак на хрысцінах з удзелам цяжарнай. Ян Васілевіч, рымар і гаспадар гарадзенскага палаца віленскага ваяводы і гетмана ВКЛ Казіміра Яна Паўла Сапегі, падаў скаргу на намесніка Гарадзенскага павета Казіміра Усовіча і яго жонку Кацярыну Шульцаўну[9]. Жанчына абвінавачвалася ў збіцці цяжарнай жонкі на хрысцінах у пана Дубельскага. У адказ была скарга Усовіча, дзе сітуацыя была прадстаўлена па іншаму. Жонка Васілевіча не раз абражала Кацярыну, а на хрысцінах таемна так моцна ўдарыла яе па твары цэглай, што тая аж разляцелася, убор з галавы зарвала, пашарпала чадру (6 злотых), каптурак (5 злотых), а гарнастаевая шапка (10 злотых) згінула. Умацаваны Януш Конча апелюючы да заканадаўства як у справе за збіццё шляхты патрабаваў выплаты навязкі і смяротнага пакарання для жанчыны (Статут, р. 11, арт. 17, 27, 35, 49). Скаржнік быў гатовы да прысягі, каб яе адправілі на смерць. Умацаваны Пётр Сулеўскі дамогся, каб Васілевіча ўзялі на парукі, хоць у яго не было жытла ў горадзе і жыў ён у доме гетмана. Радзецкі пісар Барталамей Цвікліч ад імя брацлаўскага мастаўнічага Якуба Сцяцкевіча ўзяў на парукі да вырашэння справы (1690). Канчатковага прысуду па справе не выяўлена[10].

Не захаваліся метрычныя кнігі народжаных з гарадзенскіх храмаў за гэты перыяд. Таму прааналізаваць парадак хрышчэння дзяцей не падаецца магчымым, таксама як і выявіць статыстыку па дзіцячай смяротнасці. У Гародні існавалі праваслаўны, каталіцкі і ўніяцкі абрады хрышчэння. У залежнасці ад веравызнання пахрысціць маглі ў Каложскай, Прачысценскай, Васкрэсенскай і Чэснага крыжа цэрквах, а таксама ў Фарным касцёле і касцёлах ордэнаў – бернардынскім, бернардынак, брыгітак, езуіцкім, францысканскім, кармеліцкім і дамініканскім.

Выгляд немаўля, якога трымае маці, можна пабачыць на гравюры Адэльгаўзера-Цюндта 1567–1568 гг. Яно туга закручана ў пялюшкі, якія зафіксаваны вяровачкай, а на галаве – чэпчык. Практычна дзіцё не мела магчымасці вольна

---

[6] Kurczewski J. *Stan kościołów parafialnych w djeceziej wileńskiej po najściu nieprzyjacielskiem 1655–1661 r.* Litwa i Ruś, 1912, t. II, zesz. 1, 60.

[7] *Lietuvos Metrika*, kn. 32 (1548–1549): Užrašymų knyga 32. Parengė A. Blanuca, D. Vashchuk, D. Antanavičus, E. Deveikytė, Vilnius, 2012, 68; НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 82–83 адв.

[8] НГАБ. КМФ-18, спр. 123, арк. 255-256; Jodkowski J. *Cechy grodzieńskie w wiekach dawnych*. Grodno, 1926, 19.

[9] Кацярына паходзіла з мяшчанкай сям'і.

[10] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 3, арк. 59–59 адв., 62–63; Сліж Н. *Злачынства і злачынцы ў Гародні ў XVII ст.* Arche. Гарадзенскі міленіум, 2014, № 11, 169.

шавяліць ручкамі і ножкамі. Такая традыцыя спавівання існавала таксама ў іншых краінах. Рабілася гэта, каб не былі скрыўленымі часткі цела[11]. Іншыя мастацкія прыклады з гісторыі дзяцінства можна пабачыць у гарадзенскіх касцёлах. Іх прадстаўляюць абразы Маці Божай з дзіцём і Антонія Падуанскага з дзіцём. Таксама ў аздобе храмаў можна пабачыць анёлкаў, якіх увасабляюць маленькія дзеткі. Аднак большасць мастацкіх рэчаў датуецца XVIII–XIX стст. За XVII ст. захавалася значна менш у сувязі з дзеяннямі маскоўскіх войскаў[12].

Выяўленчае мастацтва Гародні не прадстаўляе нам вялікую галерэю па гісторыі дзяцінства[13]. Няма ў ёй сямейных партрэтаў мяшчан. Захаваліся асобныя ананімныя выявы дзяцей за XVI–XVII стст. Узрост іншых дзяцей на гравюры Адэльгаўзера-Цюндта 1567–1568 гг. дакладна вызначыць складана, прыкладна да 10–12 год. Крыніца дае вельмі агульнае ўяўленне пра дзіцячую вопратку. Яна адносіцца да летняга сезону. Хлопчыкі насілі кашулю і нагавіцы. Прыклад адзення дзяўчынак можна пабачыць на сюжэце каля калодзежа. Дзяўчынак маглі апранаць у доўгія сукенкі (летнікі) з кароткім рукавом, зашпіленыя на гузікі. Паверх сукенкі накідваўся саян. А на галаве – высокі каўпак. Гэты строй падобны на строй маці, якая трымае дзяўчынку за руку[14].

Яшчэ адзін дзявочага ўбрання на абразе „Танец смерці"[15]. На адным з сюжэтаў прадстаўлены танец смерці з дзіцём. Ролю дзіця, над якім таксама пануе смерць, гуляе дзяўчынка. Яна апранута ў белую сукенку з чырвоным поясам.

***Гульні і вольны час***. Вельмі мала інфармацыі можна сказаць пра вольны час мяшчанскіх дзяцей[16]. Таксама невядома на якіх казках гадавалася дзеці і якія песні ім спявалі. У адвалах падчас „экскаватарнай археалогіі" на Савецкай плошчы, сярод іншых артэфактаў, была знойдзена гліняная свістулька[17] XVIII ст.[18] Гэтая цацка карысталася папулярнасцю сярод дзяцей. Асноўнымі матэрыяламі для вырабу іншых цацак маглі быць дрэва і гліна. У дзяцей не было сваёй прасторы ў доме. Колькасць пакояў была вельмі абмежаванай і дзеці жылі разам з бацькамі[19]. Таму і рэчы дзяцей былі ў агульным пакоі.

---

[11] Żołądź-Strzelczyk D. *Dziecko w dawnej Polsce*..., 102–108.

[12] Апісанне ўнутранага ўбрання касцёлаў гл.: *Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa trockiego. Grodno*. Cz. 4. T. 1–4. Red. M. Kałamajska-Saeed, Kraków, 2012–2018.

[13] Пра дзяцей у еўрапейскім мастацтве гл.: Арьес Ф. *Ребёнок и семейная жизнь*..., 44–56.

[14] Сліж Н. *Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюндта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця*. Arche. Гарадская гісторыя Беларусі, 2017, № 2, 37.

[15] Пра абраз гл.: Sliž N. *Obraz Taniec śmierci w Grodnie jako źródło wizualne i literackie*. Zeszyty Historyczne. Prace Naukowe Akademii im. Jana Długosza, 2015, t. XIV, 27–50.

[16] Пра гульні дзяцей у Еўропе гл.: Арьес Ф. *Ребёнок и семейная жизнь*..., 72–108.

[17] Цяпер свістулька захоўваецца ў музеі ліцэя № 1 г. Гродна.

[18] Госцеў А., Кіркевіч А. *Савецкая плошча як археалагічны помнік*. Гарадзенскі гадавік, 2012, № 1, 89.

[19] Пра побыт мяшчан гл.: Сліж Н. *Побыт гарадзенскіх мяшчан у XVI – першай палове XVII стст.* Origines, fontes et narrationes – pośród kręgów poznania historycznego. Prace ofiarowane Prof. Marcelemu Antoniewiczowi w 65. rocznicę urodzin. Pod red. M. Cetwińskiego, M. Janika, przy współudziale M. Nity. Częstochowa, 2017, 627–651.

На гравюры бачна як на падворку хлопчык з хварасцінай ходзіць за пеўнем. Тут цяжка адназначна казаць ці гэта быў абавязак даглядаць за птушкамі, ці хлопец такім чынам гуляў на падворку.

***Адукацыя***. Для мяшчан прафесія мела важная значэнне як крыніца заробку. Аднак яе набыццё каштавала дорага. Тым не менш бацькі намагаліся даць адукацыю дзецям. Як правіла дзяцей імкнуліся навучыць рамяству. Гарадзенскія мяшчане набывалі розныя прафесіі: катляр, мечнік, цырульнік, кравец, шавец, кушнер, злотнік і іншыя. Табіяш Дорбах, сендык, прадаў за 100 злотых пляц на вул. Златарскай лаўніку Адаму Цвіклічу і Зузанне Тарасевічаўне, каб сына адправіць на навучанне на цырульніка і купіць яму інструменты (1641)[20]. Згодна з тэстаментам цэхмайстра гарбароў Адама Мігоўца сын Радзюк быў накіраваны да краўца, а Іван, пры жаданні, мог займаецца рамяством бацькі (1642)[21]. Дзеці лаўніка Станіслава Мазніцкага былі выпраўлены наступным чынам: Мацей – на службу ў Польшчу, а Войцех – на навучанне кравецкаму рамяству (1640)[22].

Некаторыя мяшчане адпраўлялі вывучаць дзяцей „свабодныя навукі". У іх склад уваходзіла граматыка, дыялектыка, рыторыка, музыка, арыфметыка, геаметрыя, астраномія. Радца Марцін Фандэберг накіраваў на вучобу сына Яна, а радца Фёдар Багдановіч – Самуэля Яна. Абодва прасілі ў тэстаментах жонак прыкласці намаганні для сканчэння адукацыі. Праўда не было адзначана месца навучання. А старэйшы сын Ф. Багдановіча – Пётр быў на службе пры двары смаленскага кашталяна Юрыя Храптовіча[23]. Аднак не ўсё мяшчане мелі кантакты са шляхтай, не кажучы пра магчымасць адправіць на адукацыю пра шляхецкім двары.

Рэдка гарадзенскія мяшчане сустракаюцца ў спісах універсітэтаў. Так, Лука Мікалай Адольскі быў запісаны ў Кракаўскім універсітэце (1549)[24]. Базыль Гранда фігураваў як студэнт Вітэнбергскага (1573), Франкфуркцкага (1579) і Іенскага (1580) ўніверсітэтаў[25].

Калі глядзець на адукацыю гарадзенскіхураднікаў праз іх працу і дакументы ў магістрацкіх кнігах, то прасочваецца наступнае. Яны валодалі рознымі мовамі: старабеларускай, польскай, лацінскай, акрамя таго, былі дасведчаны ў галіне магдэбургскага права. Усё гэта было неабходна для вядзення справаводства і прыняцця судовых рашэнняў. Асоб, якія не адпавядалі патрабаванням, маглі адсунуць ад пасады. Так, кравец Міхаіл Якуцэвіч быў адхілены з пасады шафара з прычыны неадукаванасці (1609)[26].

---

[20] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр 1, арк. 195–196.

[21] Тамсама. Арк. 218–219 адв.

[22] Тамсама. Арк. 56–57.

[23] Інфармацыя пра навучанне дзяцей згадваецца ў тэстаментах М. Фандэберга (1642) і Ф. Багдановіча (1640). НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр 1, арк. 239 адв.; Сліж Н. *Тастамент гарадзенскага радцы Фёдара Багдановіча.* Архіварыус. Вып. 12 (2014), 65–85.

[24] *Metryka czyli album Uniwersitetu Krakowskiego z lat 1509–1551. Biblioteka Jagiellońska rkp. 259*. Wyd. A. Gąsiorowski, T. Jurek, I. Skierska przy wsp. R. Grzesika. Warszawa, 2010, 265.

[25] Friedländer E., Liebe G., Hermann Th., Theuner E. *Aeltere universitäts matrikeln*, Bd. (1506–1648), Leipzig, 1888, 276; Грицкевич В.П. *С факелом Гиппократа: из истории белорусской медицины*. Минск, 1987, 94.

[26] Lietuvos Vaištybes istorijos archyvas. F. 1282. A. 1 B. 7021. L. 1.

Крыніцы згадваюць пра наяўнасць кніг у мяшчан. У былога месцкага пісара Багдана Хведкевіча захоўваліся кнігі рэлігійнага зместу: Пралог (рубель грошаў), Чэцьі-Мінеі (40 грошаў), Трэбнік (пол капы літоўскіх грошаў), Патрэбнік (2 капы), два Актоіха (кожны па капе грошаў) (1540)[27]. У тэстаменце радцы Валентыя Волінскага згадваюцца Саксонскае Люстра на лацінскай мове і „Practicarum observationum…”[28] Андрэя Ліпскага. Магчыма мяшчане карысталіся выданне Вейхбільда Паўла Шчэрбіча[29]. У аддзеле Рэдкай кнігі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея захоўваецца асобнік з паметамі на палях. Почак характэрны для першай паловы XVII ст. Сама кніга паходзіць з бібліятэкі гарадзенскіх дамініканцаў.

Усе гарадзенскія цэхі прымалі на вучобу вучняў. У статутах агаворваліся ўмовы прыняцця, тэрмін навучанне, аплата, пераход у статус майстра. Некаторыя перавагі мелі дзеці майстроў. Згодна з першым цэхавым статутам 1570 г. усталёўвалася майстарам перыяд навучання. Па яго сканчэнню вучань плаціў ¼ каменю воску, а пасля станавіўся таварышам[30]. Статут мулярскага цэху агаворваў, што для навучання патрабаваліся ўнёсак 8 грошаў і пасведчанне аб добрым паходжанні. Адукацыя працягвалася тры гады ў аднаго майстра (1593). Пры ўцёках да другога майстра вучань вяртаўся да першага. Перайсці можна было толькі пры неадпаведным стаўленні майстра да вучня і з дазволу старшых цэха. Пасля сканчэння навучання вучань станавіўся таварышам і павінен быў год адпрацаваць у майстра за заробак, атрымаць пасведчанне і год вандраваць. А калі таварыш не хацеў выпраўляцца ў вандроўку, то быў абавязаны даць 4 злотых да скрынкі. Майстар меў права трымаць толькі тры вучня[31].

Статус вучня і яго абавязкі агаворваліся таксама ў іншых статутах. Больш дэталёва гэта можна пабачыць у статуце таварышаў кавальскага і катлярскага цэхаў, які быў прыняты ў 1674 г. Так, у катэгорыю вучня траплялі хлопцы, якія знаходзіліся пры майстры да дасягнення паўналецця. У абавязкі вучня ўваходзіла трымаць парадак у майстэрні. Перад вызваленнем ад майстра меў права звярнуцца да таварышаў за дапамогай, а пасля год адпрацоўваў у майстра. Кожную чвэрць года былому вучню маглі павысіць аплату, калі таго заслугоўваў[32]. Статуты не агаворвалі ўзрост у якім хлопец прымаўся ў рамяство. Найбольш верагодна, што гэта адбывалася ў падлеткавым перыядзе, каб ужо пасля паўналецця была прафесія і магчымасць зарабляць на сябе.

---

[27] *Акты Виленской археографической комиссии*. Т. 17. Акты Гродненского земского суда. Вильна, 1890, 242–243.

[28] Кніга Ліпскага А. перавыдавалася некалькі разоў (Lipski A. *Practicarum observationum ex jure civili et Saxonico collectarum, et ad stylum usumque judiciorum curiae regalis accommodatarum*, centuria I[-II] 2, Centuriae II. – Riga 1602; Kraków 1619; Kraków 1620; Poznań 1626; Gdańsk 1627). Якім выданнем валодаў В. Волінскі невядома.

[29] Szczerbic P. *Jus municipale, to jest prawo miejskie magdeburskie nowo z łacińskiego i niemieckiego języka z pilnością i wiernie przełożone,* Poznań, 1610, 21, 23, 33, 79 і інш.

[30] НГАБ. КМФ-18, спр. 62, арк. 75–79 адв.

[31] Тамсама. Спр. 77, арк. 423–426.

[32] Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka. F. 1-585.

На адукацыю аддавалі хлопчыкаў. Адукоўваць дзяўчат было немэтазгодна. У рамеснікі іх не бралі. Хаця на практыцы вядома выпадкі, што жанчыны займаліся рамяством, напрыклад, кравецкім[33]. Не ўсе віды прафесій былі ім даступны па гендэрных асаблівасцях.

Калі сыходзіць з дакументаў, то пераважна добрую адукацыю атрымлівалі дзеці з сямей ураднікаў, якія пазней ішлі па шляху бацькі. Іншая частка мяшчанства была неадукаванай, бо нават пры продажу маёмасці не маглі паставіць подпісы. Рамеснікі імкнуліся навучыць сваіх дзяцей рамяству. Пры чым не абавязкова па бацькоўскай прафесіі.

***Дзеці ў хваробах і небяспецы***. Стаўленне да дзяцей праяўлялася ў бацькоў, калі яны траплялі ў небяспечную сітуацыю. У тыя часы хвароба стварала сапраўдную небяспеку для жыцця дзяцей. Медыцына не магла дапамагчы ў многіх выпадках. У адчаі мяшчане звярталіся за дапамогай да цудатворнага абраза Маці Божай Студэнцкай, які знаходзіўся ў касцёле Св. Францыска Ксаверыя. У Гародні толькі гэтаму абразу быў прысвечаны „Збор цудаў…"[34]. У крыніцы зафіксавана



Хлопчык на падворку, гравюра Адэльгаўзера-Цюндта 1567–1568 гг.






Свістулька XVIII ст.

Маці і дзіця, гравюра Адэльгаўзера-Цюндта 1567–1568 гг.

[33] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 20–20 адв.

[34] Сліж Н. *„Збор знакамітых цудаў і ласкаў Найсвяцейшай Панны Марыі Студэнцкай" як крыніца па гісторыі Гародні*. Архіварыус, 2009, вып. 7, 132–181; її ж. *Лава ў капліцы Маці Божай Студэнцкай у фарным касьцёле Гародні*. Arche. Другая Гародня, 2010, № 1, 2, 66–98.

12 выпадкаў зваротаў мяшчан у сувязі з хваробамі дзяцей. Вылячэнне ад захворванняў атрымалі дзеці Яна Паўловіча (1662), Дароты Пастэўчанкі і бурмістра Пятра Ляўковіча (1662), Барбары Еляшовай (1663), Дароты Грыжоўскай (1663), Тэадора Гібулы (1664), Кацярыны Крыштафавай (1663), Стэфана Мацялевіча і Параскі (1663), Зафеі Мікалаевай (1663), гарадзенскай краўцовай Юстыны Міхалавай (1664), Яна Ткачоўскага (1663), нейкай мяшчанкі (1686), дзяўчына Канстанцыя Філіпавічаўна (1664). Сярод хвароб згадваліся панос, язвы, ванітаванне, паламаныя ногі, бяльмо на вачах, а часам проста цяжкія хваробы[35].




Выява з абраза „Танец смерці", канец XVII ст. – пачатак XVIII ст.



Абраз Маці Божай Анёльскай у францысканскім касцёле, XVII ст.



Дзеці, гравюра Адэльгаўзера-Цюндта 1567–1568 гг.

У некаторых выпадках у „Зборы цудаў …" прыводзяцца кранальныя словы бацькоў, які сведчаць пра іх перажыванне за лёс дзяцей:

У той жа год [1663] дзіцё Кацярыны Крыштафавай, гарадзенскай мяшчанкі, захварэла на ўнутраныя язвы ў галаве. Ужо аплаквалі бацькі, разумеючы, што ўвесь мозг дзіцяці запаліўся і ператварыўся ў гной. Хацелі для сына зрабіць тое, што бацькоўская любоў казала, колькі маглі на медыкаў і медыцыну спадзяваліся. Але з часам, шкадуючы дзіцё, толькі грошы распусцілі! Здароўя дзіцяці не вярнулі! Кажа тады Кацярына мужу: „Ці не лепш было б, калі б мы дзіцё пад апеку аддалі тутэйшай Найсвяцейшай Панне, якая глядзіць не на багатую шкатулку, а на набожную пакору. І не так сабе з чыстага золата воты і каштоўныя рубінавыя падвескі, як адзіны набожны зварот цэніць. Ну, тады пойдзем да яе. Як у мозгу вада не адыходзіць, хоць бы мы ўсе з яго пілі, так і не змяншаецца міласэрнасць і моц Панны Марыі. Хоць ужо не палічыць розных цудаў і ласкаў, якія яна людзям

[35] *Sumaryusz cudow*..., 15–18, 32, 34, 35, 42, 43, 54, 69, 75.

зрабіла". Адказаў муж: „Увогуле, даўно ўжо трэба было так зрабіць". Прынеслі тое дзіцё да абраза нашай Найсвяцейшай Панны, каб само дзіцё перад ім паставіць і атрымаць для яго здароўе. Толькі пачалі маліцца, як язвы згінулі[36].

Другі прыклад:

У Гародні, каралеўскім і соймавым мястэчку, дзіцё Зафеі Мікалаевай у 1663 г. захварэла на чырвоную дызентэрыю і два тыдні хварэла. Шмат хатніх лекаў, шмат прывазных лекаў выкарысталі. Аднак дзіцё па-ранейшаму хварэла! І ўвогуле, ад штодзённага ўжывання лекаў стан яго пагаршаўся! Нічога не заставалася, каб заплаканая маці магла вылечыць аплаканае дзіця. Кажа: „Зрабіся воля твая, Усёмагутны Стваральнік! Ты можаш і вярнуць да жыцця, і да труны спіхнуць і справадзіць. Розгай помсты справядлівай сцягаеш за грахі нашы і, каб цябе разгневанага, прасілі чыніш ласку. Тады скараюся я перад слушным судом тваім праз хваробу сына майго і праз мой смутак! Вызнаю, што салодкі і літасцівы, і калі нас на тым свеце караеш тады самы літасцівы. Цалую руку Айца, Божа мой: дай палёгку тваёй скоранай нявольніцы. З-за Тваёй нявыказанай дабрыні, з-за адзінай абранай Панны Марыі, Маці Ісуса Хрыста, зірні на сіроцтва маё. Ты, суцяшальніца грэшных, Найсвяцейшая Панна, у новым з'яўленым абразе Найдзіўнейшая, важная твая інстанцыя, скажы твайму Усёмагутнаму Сыну, каб майго сына пазбавіў ад паносу, а мяне ад гора". Такім чынам малілася, шмат намаганняў зрабіла, учыніла воту, і крывавая хвароба адразу загаілася, сыночак ачуняў[37].

Гэтыя два прыклады яскрава паказваюць перажыванні бацькоў за лёс дзяцей. У іх прыводзяцца словы бацькоў, якія напоўненыя горам і адчаем. Яны не былі абыякавы да сваіх дзяцей, шукалі для іх сродкі выздараўлення нават надзвычайныя. У небяспечных сітуацыях бацькі гатовы былі зрабіць усё магчымае і немагчымае.

***Выхаванне ў чужой сям'і***. Па розных абставінах дзеці маглі патрапіць на выхаванне ў чужую сям'ю. Гэта магло здарыцца ў выпадку сіроцтва, адсутнасці фінансавай магчымасці ў бацькоў утрымліваць дзяцей і інш. Выхаванцы станавіліся часткай другой сям'і і, нават, згадваліся ў тэстаментах. Рэгіна Гаўловічаўна прабачыла сваёй выхаванцы Мяшковай пазыку і казала вярнуць ёй застаўленыя кацялок, чарку і поўгарцоўку (1640)[38]. Юрый Стрэчэня прызначыў для свайго выхаванца Алеся Ябланоўскага 30 злотых. Сваіх дзяцей у яго не было (1664)[39]. Дачка бурмістра Яна Адамовіча – Клара ў дзяцінстве была ўзята на выхаванне шваграм Адамовіча – Бернатам Весянеўскім. Ён паабяцаў дагадаваць яе да паўналецця і выдаць замуж. Па гэтай прычыне з бацькоўскай маёмасці ў тэстаменце ёй пасаг не вылучаўся (1666)[40].

Аднак у дакументах толькі згадваецца пра наяўнасць выхаванцаў, не агаворваюцца пры якіх абставінах і чаму дзеці патрапілі ў іншую сям'ю. Гэтыя звесткі сведчаць пра існаванне гэтай з'явы ў мяшчанскім асяроддзі.

---

[36] Ibid, 34–35.

[37] Ibid, 42–43.

[38] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 129 адв.

[39] НГАБ. Ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 92.

[40] Тамсама. Арк. 125 адв.

***Апека***. Інстытут апекі быў вядомы ў ВКЛ сярод розных саслоўяў. У мяшчанскай сям'і галоўным быў бацька. Таму ён у сваім тэстаменце прызначаў апекуноў жонцы і дзецям. Як правіла гэта было некалькі асоб. Вельмі часта сярод іх сустракаюцца сваякі, ураднікі магістрата, шляхта. Яны даглядалі за дзецьмі і іх маёмасцю да дасягнення паўналецця, а пасля прадстаўлялі справаздачу і перадавалі ўласнасць спадчыннікам. Апекуны былі абавязаны абараняць інтарэсы сірот (Вейхбільд, арт. XXVI, Саксонскае Люстра, ч. I, арт. 41, 42, 52). Матыс Пастэўка прызначыў жонцы і дзецям апекуноў лаўніка Андрэя Макоўскага і Барталамея Цярлея (1640), Фёдар Багдановіч – бурмістра Стэфана Гібулу, радцу Станіслава Бельскага, радцу Яраша Высоцкага і сендыка Адама Цвікліча (1640), Марцін Фандэберк – падканцлера ВКЛ Марціна Трызну, ксяндза і рэферэндатара ВКЛ Францішка Далмата Ісайкоўскага, гарадзенскага мешчаніна Юзафа Градкоўскага (1642), Ян Адамовіч – швагра Берната Весянеўскага, бурмістраў Гануса Паўльсена і Канстанцыя Дзіву (1666), кравец Тамаш Цупрыкоўскі – радцу Яна Зеляпугу, лаўніка Марціна Шаматулу Сапінскага, цэхмастра краўцоў Яна Рошчынскага (1666), лентвойт Казімір Цвікліч – гарадзенскага земскага суддзю Тамаша Валовіча, гарадзенскага падпробашча Якуба Бельскага, старога бурмістра Гануса Пальсена, стрыя Адама Цвікліча (1671)[41].

У некаторых выпадках вызначалася таксама месца жыхарства дзяцей. Ян Хацкевіч Воўк вызначыў пражыванне дачкі ад першага шлюбу Палосю пры другой жонцы Марусі для выхавання і адукацыі, а апекунамі былі запісаны лаўнік Пётр Ляўковіч і швагер Ян Крупка (1659)[42].

Жанчына таксама вылучала апекуноў, калі на момант складання тэстамента ўжо памёр муж, а дзеці былі непаўналетнія і заставалася без дарослых. Ганна Лубянка, удава па Барташу Цвіклічу, дом і рэчы пакінула сыну ад першага шлюбу Сымону Гемзінскаму. Так як сын яшчэ быў непаўналетнім аддала яго ў апеку Адаму Цвіклічу і Тамашу Янчэўскаму (1639)[43]. Ганна Чарнікоўна перадала ў апеку дачку Паланею лентвойту Ганусу Паўльсену і войтаўска-лаўнічаму пісару Аляксандру Дрогашу. Яна прасіла, каб яны абаранілі дзяўчыну ад крыўдаў і захавалі за ёй яе нерухомасць (1674)[44].

Пасля сканчэння тэрміна апекі апекуны былі абавязаны перадаць спадчыннікам належную ім маёмасць. Гаспадарскі страхар Павел Шкебель на ўрадзе вызнаў пра перадачу спадчыны дзецям мешчаніна Мацея Яновіча – Станіславу, Венцлаву і Ганне. Ён прадставіў тэстамент і сведчыў, што ўся працэдура адбывалася згодна з ім. Сыны атрымлівалі раллю і рухомыя рэчы, а дачка – 70 грошаў, карову, тры авечкі і дробныя рэчы. Акрамя таго, на іх прыйшлася спадчына па брату маці Лаўрыну Вайтковічу – дом на Гарадніцы і ралля на Перасеце. Пасля яго смерці цесць Ян Хадковіч, віннік, адпісаў усё дзецям Мацея. Па рашэнню суда гэта маёмасць перайшла Ганне, бо браты атрымалі сваю частку з бацькоўскай спадчыны. Да таго яшчэ яны павінны ёй даць 70 грошаў, а рухомыя рэчы яна ўжо на той час атрымала (1540)[45].

---

[41] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 133, 155, 240 адв.; ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 126, 129, 212.

[42] НГАБ. Ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 13 адв. – 14 адв.

[43] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 121 адв. – 122 адв.

[44] НГАБ. Ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 278 адв.

[45] Інфармацыя са справы за 1540 г. *АВАК*. Т. 17. Акты Гродненского земского суда, 101–102.

Калі жонка трымала маёмасць пасля смерці мужа, то павінна была яе даглядаць і даваць справаздачу дзецям пасля дасягнення імі паўналецця. Калі старэйшы сын лаўніка Станіслава Мазніцкага Мацей дасягнуў паўналецця – 21 года, то ўзяў у апеку малодшага брата, якому было на той час 17 год. Маці Ядвіга Наленчоўна выйшла другі раз за Тамаша Янчэўскага. Яны прадставілі сынам дакументы і спіс пазыкаў Мазніцкага, за якога выплацілі 233 злотых і 16, 5 грошаў. Аднак для пакрыцця ўсіх пазыкаў прадалі дом з пляцам і агародам на вул. Азёрскай за 250 злотых Юрыю Быхнеру і яго жонцы. Мацей прыняў справаздачу, адзначыў, што не мае да маці прэтэнзій (1640)[46].

Гальшка Зялеская ў шлюбе з лаўнікам Касперам Рэйхенбергам нарадзіла сына Астафея. Але пасля смерці мужа выйшла замуж за лаўніка Мікалая Кудаеўскага і сын гадаваўся да паўналецця ў іх сям'і. У 1645 г. Гальшка і Мікалай вылучылі Астафею спадчыну: 1,5 валокі ў Малахавічах, 0,5 у Гнойніцы, чатыры валы, дзве каровы, два коні, дзве авечкі, пяць свіней. А Мікалай Кудаеўскі павінен быў пабудаваць святліцу з сенямі і адрыну, даць за збожжа 150 злотых[47]. Сыны Яна Дзівы – Пётр і Канстанты сведчылі, што ўсе рэчы, якія ім прыйшліся па бацьку, серабро, золата і інш., яны атрымалі ад айчыма Яраша Высоцкага, радцы (1640)[48]. Увесь парадак перадачы маёмасці фіксаваўся ў дакументах, якія заносілася ў магістрацкія кнігі. Неабходна гэта была, каб пасля спадкаемцы не прад'яўлялі маёмасных прэтэнзій апекунам.

Апекуны мелі права прадаць маёмасць непаўналетняга ў выпадку неабходнасці. Зразумела, што дзеці былі праінфармаваны пра здзелку. Сымон Гемзінскі вымушаны быў прадаць дом з пляцам па вул. Азёрскай Станіславу Іваноўскаму і яго жонцы Дароце Плоншчанцы за 500 злотых, бо пасля смерці маці трэба было вяртаць пазыкі і выплачваць прызначаныя за ўспамін душы касцёлам грошы, а таксама рамантаваць дом. Продаж быў здзейснены з дазволу апекуноў (1639). Барташ Ласкоўскі і Ядвіга Ліўчанка, Станіслаў Мейснер і Зузанна Ліўчанка, апекуны дзяцей па нябожчыку лаўніку Міхаілу Ліўчыку – Рэгіны і Тэафіліі – Казімір Роса і Тамаш Лагоўскі прадалі пляц на вул. Азёрскай за 300 злотых жонцы маршалка ВКЛ Крыштафа Весялоўскага Аляксандры Сабескай (1643)[49].

З-за апекуна часам ствараліся маёмасныя праблемы. Ян Юрэвіч (Юргевіч) апякаў малодшых братоў Фёдара і Яна. Усю маёмасць па бацьку і маці ён ужыў на сваю карысць, пазычыў грошы ў Якуба Гзоўскага (20 коп літоўскіх грошаў), Адама Юргевіча (15 коп). Ян памёр і з гэтымі пазыкамі пакінуў разбірацца малодшых братоў. Каб атрымаць свой дом на вул. Рэзніцкай браты вымушаны былі заплаціць яго пазыкі. Пазней Фёдар з жонкай Ганнай Талочкаўнай і Ян прадалі гэты дом за 52 капы Яну Бенкоўскаму (1616)[50].

Выхад з паўналецця мог суправаджацца судовымі працэсамі. Вацлаў Самоша абвінавачваў радцу Тамаша Адамовіча і яго родных Стэфана і Станіслава, як нашчадкаў бурмістра Яна Адамовіча і Агнешкі Весянеўскай, у нявыдачы рухомых

---

[46] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 56–57.

[47] Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka. F. 16-207. L. 47.

[48] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 187 адв. – 188 адв.

[49] Тамсама. Арк. 122 адв.–123 адв., 250–251.

[50] НГАБ у Гродне. Ф. 1664, воп. 1, спр. 380.

рэчаў, камянічкі і аптэкі пасля дасягнення дарослага ўзросту. Іх бацькі ўзялі яго ў апеку пасля смерці бурмістра Міхаіла Самоша і Цэцыліі Весянеўскай (1674)[51].

Інстытут апекі адносна дзяцей працаваў у мяшчанскім асяроддзі. На практыцы гэта выглядала наступным чынам. Спачатку апекуны прызначаліся ў тэстаменце. Пасля смерці аднаго з бацькоў яны займаліся справамі дзяцей да іх паўналецця. З дасягненнем 21 год перадавалі маёмасць нашчадкам згодна з дакументамі.

***Размеркаванне спадчыны, абавязкі дзяцей адносна бацькоў***. Вызначэнне спадчыны, парадак яе размеркавання агаворваўся ў заканадаўстве. Да яе адносілі рухомыя і нерухомыя рэчы (Вейхбільд, арт. LVII, LVIII, LIX, LXI–LV IIII; Саксонскае Люстра, ч. I, арт. 5, 6, 11, 21, 22). Дзеці былі асноўнымі спадкаемцамі бацькоў. Як правіла маёмасць размяркоўвалася ў роўнай меры паміж сынамі і дочкамі. Часам атрыманне спадчыны залежала ад стаўленне дзяцей да бацькоў. Абавязак бацькоў быў выдаць замуж дачок і ажаніць сына. Як правіла пры гэтым вылучалася частка маёмасці для будучай сям'і. Канечне, яе доля залежала ад матэрыяльнага стану сям'і. Канчатковае размеркаванне маёмасці адбывалася ў актах апошняй волі.

Тэстаменты відавочна паказваюць, што ад дзяцей чакалася ў старасці падтрымка і дагляд. Не менш важна было выкананне апошняга абавязку: пахаваць цела і ўспамінаць душу. У дакументах апошняй волі дзеці, калі яны былі на той час дарослыя, часта фігуравалі як асобы адказныя за пахаванне і ўспамін душы. Але гэта было ў тых выпадках, калі другі сужэнец ужо на той час памёр. Напрыклад, Дзем'ян Радзівановіч прасіў дзяцей пахаваць у царкве пры першай жонцы (1639)[52], Алена Зглечэўская – ў Фарным касцёле побач з мужам Андрэем Смяроўскім (1642)[53], Ягнешка Наркевічоўна – ў Фарным касцёле (1643)[54], Фёдар Барсуковіч – на могілках у Мёлах (1663)[55], Ганна Ёрданаўна – ў бернардынскім касцёле (1668)[56], бурмістр Адам Цвікліч – у Фарным касцёле (1673)[57], Ганна Чарнікоўна – у бернардынскім касцёле (1674)[58].

У некаторых тэстаментах можна сустрэць блаславенне дзяцей перад смерцю. Рэгіна Гаўлоўвічаўна, жонка Яна Прылуцкага, блаславіла сваіх дзяцей (1640): „Potym błogosławieństwo dziatkom macierzyńskie ostawiła y błogosławiła, w opiekie Bogu Wszechmocnemu oddaiąc y do zgody zobopolney napominaiąc y swoie dusze y rodzicielskie modlitwow ich poruczaiąc"[59]. Ян Хацкевіч Воўк даў бацькоўскае блаславенне дачцэ Палосі і наказ шанаваць яго другую жонку Марусі як маці, якой яна была перададзена ў апеку (1659)[60].

---

[51] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 366.

[52] Тамсама. Арк. 107.

[53] Тамсама. Арк. 226 адв.

[54] Тамсама. Арк. 267.

[55] НГАБ. Ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 76–77.

[56] Тамсама. Арк. 166.

[57] Тамсама. Арк. 265 адв.

[58] Тамсама. Арк. 278 адв.

[59] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 130.

[60] НГАБ. Ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 13 адв.–14 адв.

Калі на момант напісання тэстаменту яшчэ была жыва жонка, то як правіла яна пакідалася пражываць да канца жыцця ў маёмасці, а пасля яе смерці яна канчаткова дзялілася паміж нашчадкамі. Урбан Каменскі захаваў за жонкай Марынай Рашкоўнай пажыццёвае пражыванне ў доме на вул. Рэзніцкая. Пасля яе смерці ён пераходзіў яго сыну Яну Каменскаму і сыну жонцы Пятру Сыльвестравічу (1640)[61]. Андрэй Смяроўскі прызначыў жонцы Алене Зглечэўскай пажыццёвае пражыванне ў доме на вул. Маставая, зяць Станіслаў Бельскі, пісар, атрымаў дом, у якім жыў з дачкой Ядвігай і дзецьмі, а трэці дом на вул. Віленская прызначаўся сыну Яну і жонцы Кацярыне Мерэеўшчанцы (1639). У сваім тэстаменце Алена перадала дом на Маставой сыну, рухомую маёмасць падзяліла прыкладна аднолькава паміж сынам і дачкой, але апошняй асобна прызначыла свой пасаг (1642)[62].

Стэфан Міговец дом на вул. Падольная, каля Нёмана, прызначыў жонцы Паланеі Валянцінаўне для пажыццёвага пражывання. Пасля яе смерці ён пераходзіў 4 дзецям. Адзначалася, што сын Пракоп, свяшчэннік у Васількаве, ужо ўзяў на вучобу сваю частку рухомай спадчыны грашыма. Бацьку даглядаў Адам за свае грошы. Таму пры падзеле Пракоп, Мікалай і Аўдоцця, якая замужам за Хведарам, павінны будуць яму кампенсаваць выдаткі. А калі яны не захочуць гэта рабіць, то дом – Адаму (1640)[63].

Ян Адамовіч, бурмістр і радца, надаў шмат увагі ў тэстаменце размеркаванню маёмасці (1666). Жонка Ягнешка Весянеўская за добрае стаўленне ў шлюбе атрымала ў дар валокі ў Адамовічах. Пры жыцці была вылучана спадчына старэйшаму сыну Тамашу (1,5 валокі) і пасаг дачцэ Зафіі пры шлюбе з Мікалаем Эйсімантам. Іншыя дзеці атрымалі таксамі зямельныя надзелы: Агата – палова валокі, Стэфан – палова валокі, Станіслаў – палова валокі, Кацярына – палова валокі (столькі ж атрымала калі выходзіла замуж за Яна Трахімовіча), Ядвіга – палова валокі, Ганна – палова валокі, Дарота – палова валокі. Клара была ўзята на выхаванне братам жонкі Бернартам Весянеўскім, які абяцаў выдаць замуж і даць пасаг[64]. Па тэстаменту Тамаша Цупрыкоўскага, краўца, жонцы Марыне Баканоўне і дзецям Кацярыне, Ядвізе, Зафеі, Антонію, Марце Ганне прызначаліся дом на вул. Плябанскай, медныя і латунныя рэчы, пазыкі, якія яму былі вінны (1666)[65].

Калі жонка ўжо памерла, то маёмасць размяркоўвалася паміж дзецьмі. У тэстаменце Фёдар Барсуковіч вылучыў кожнаму з чатырох сыноў Якубу, Касцюшку, Данілу і Сямёну па палове валокі. Так як Даніла даглядаў за ім і заставаўся апекуном сясцёр Ганны і Кацярыны, то атрымаў яшчэ рухомыя рэчы. На дачок прыйшлася чвэрць валокі (1663)[66].

Уся маёмасць Станіслава Ёшкевіча з Баранавічаў размяркоўвалася паміж чатырма дочкамі. Кацярына (жонка Марціна Казімірчыка), Ядвіга (жонка Марціна Гасперчыка) і Таццяна (жонка Юзэфа Каземячы) атрымлівалі па чвэрці валокі ў

---

[61] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 161–162 адв.

[62] Тамсама. Арк. 113-114, 226 адв. – 227 адв.

[63] Тамсама. Арк. 140–141 адв.

[64] НГАБ. Ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 125–126.

[65] Тамсама. Арк. 128 адв. – 129.

[66] Тамсама. Арк. 76–77.

Адамавічах і траціне пляца на прадмесцю ў Гародні на вул. Ніскай, а малодшая Кацярына (жонка Паўла Кас'яна) за дагляд на працягу года перад смерцю – палову валокі ў Баранавічах. Унуку Станілаву Забоедзе з дома на прадмесці Павел Кас'ян павінен быў даць кажух, сярмягу, каня (1664)[67].

У маламаёмасных сем'ях размяркоўвалі рухомыя рэчы. Матыс Гранда меў дзяцей Стэфана, Яна (памёр, быў жанаты з Зафеяй Наметкевічаўнай, пакінуў дзяцей) і Зафею (муж Крыштаф Болейка). Маёмасць была размеркавана наступным чынам: пчолы ў брата Андрэя ў Манчыне палова жонцы Яна, другая палова – зяцю з дачкой і Стэфану; пчолы ў бурмістра Грыгора Варабеевеча – зяцю, пчолы ў Фёдара Багдановіча – дачцэ, дачцэ і зяцю за дагляд 7 коп жыта, палову аўса – зяцю, дробная рухомая маёмасць пры гаспадарцы – зяцю і дачцэ[68].

Жанчыны размяркоўвалі сваю маёмасць наступным чынам. Рэгіна Гаўловічаўна адзначыла, што маёмасць (дом, зямлю, рэчы, тавар і інш.) дзяліліся роўна паміж усімі дзецьмі Агнешкай (муж Якуб Гратоўскі), Аршуляй (муж Грыгаровіч), Станіславам і Паўлам. Пасаг дачкі павінны ўключыць у падзел, а Аршуля яшчэ – карону з перламі і перлы на шыю (1640)[69]. Каб не было турботаў Кацярына Пельчанка запісала свой дом на Віленскай дачцэ Зафеі. Яе другі муж Аляксандр Карлоўскі выказаў сваё незадавальненне яе воляй. Але жанчына аргументавала, што яна не кранае маёмасць мужа, а распараджаецца сваёй (1661)[70]. Дачка была ад першага шлюбу. Кацярына сваю нерухомасць пакінула ёй, а мужу не прызначыла нічога. У сваім тэстаменце Ядвіга Каленчоўна, жонка Тамаша Масніцкага, падзяліла пляц у Гародні паміж двума сынамі (1660)[71].

Пры наяўнасці некалькіх шлюбаў маёмасць дзялілася паміж усімі дзецьмі. Марцін Сцернік падзяліў дом і рухомыя рэчы на дзве часткі паміж трыма дзецьмі ад першага шлюбу і трыма ад другога, народжаных з Агаф'яй Цімохавай. А дачка ўжо атрымала выправу, таму ў падзеле ўдзельнічаць не магла (1642)[72]. Матыс Пастэўка, швецкі цэхмайстр, быў жанаты двойчы. Другой жонкай была Марына Рагачэўшчанка. Палова дома на Рынку прыйшлася Марыне з дзецьмі ад другога шлюбу, а другая палова сыну Яну і другой дачцэ з зяцем Матыяшам. Палова пляца на Падоле была дачцэ Ганне, бо другую трымаў брат Міхаіл. Дадаткова сын атрымаў ваўчару, даламан і пояс з серабром (1640). Гэтыя і іншыя рухомыя рэчы Ян атрымаў ад мачыхі ў 1642 г.[73]

Радца Фёдар Багдановіч быў жанаты тры разы. У першым шлюбе нарадзілася тры сыны Пётр, Габрыэль і Мікалай, у другім Самуэль Ян, у трэцім – Агап'я і Аўдоцця. На ўсіх дзяцей прыходзіўся пляц на вуліцы Калючынскай, які збудаваў дзед Багдан Міхайловіч (1640)[74]. Дземян Радзівановіч быў жанаты двойчы. Ад

---

[67] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 126-126 адв.

[68] Тамсама. Спр. 1, арк. 141 адв. – 142 адв.

[69] Тамсама. Арк. 129–130.

[70] НГАБ. Ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 41–41 адв.

[71] Тамсама. Арк. 30 адв. – 31.

[72] НГАБ. Ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 233 адв. – 234.

[73] Тамсама. Арк. 132 адв. – 133, 230–230 адв.

[74] Тамсама. Арк. 150–153.

першага шлюбу нарадзіўся сын Хведар, які прапаў без вестак. Акрамя яго былі дзве дачкі Марына і Ганна. Старэйшая была замужам, а другі сын Павел быў манахам бернардынскага кляштара (1639). Гэта паўплывала на размеркаванне маёмасці. Дом і большасць рухомых рэчаў пакідаліся Ганне. У выпадку вяртання сына Хведара гэта маёмасць дзялілася паміж імі[75].

Калі дзеці не адпаведна паводзілі адносна бацькоў, то маглі застацца без спадчыны. У тэстаменце Ядвіга Януцікова з сяла Цвіклічы аддаліла ад спадчыны сына Стэфана, бо не дапамагаў і не даглядаў падчас хваробы, забраў два валы і living рознае збожжа. Яна страціла маёмасць падчас вайны, а апошнія гады ляжала з-за цяжкай хваробы. Дапамагалі сын Станіслаў і дачка Юстына, які атрымалі ў спадчыну грунт у Цвіклічах (1667)[76]. Ганна Чарнікоўна пазбавіла маёмасці сына ад першага шлюбу Сымона Каменскага. Ён набраў пазыкаў у лентвойта Ганус Паўльсена (50 злотых) і пана Шымака (100 злотых) і выехаў разам з сям'ёй з горада. У тэстаменце Ганна прасіла зяця Паўла Ланеўскага выплаціць грошы. За гэта яна запісала яму і сваёй дачцэ палову пляца на вул. Бернардынскай (1674)[77].

У мяшчанскай сям'і дзеці мелі важнае значэнне, але дарослы быў больш каштоўны за дзіцё. Дзецям імкнуліся даць адукацыю адпаведна з маёмасным станам. Уласціва гэта было для ўраднікаў. Рамеснікі аддавалі на навучанне прафесіі. Лёс дзяцей, іх здароўе турбаваў бацькоў. У небяспечных сітуацыях яны рабілі ўсё магчымае, каб іх выратаваць. Дзеці выхоўваліся не толькі ў сваіх сем'ях, але маглі патрапіць на выхаванне ў іншую. У мяшчанскім асяроддзі таксама існаваў інстытут апекі. Ён быў неабходны для асірацелых дзяцей. Апекуны даглядалі іх і маёмасць да паўналецця. Абавязак бацькоў быў выхаваць дзяцей, заключыць шлюб, размеркаваць маёмасць. Ад дзяцей чакаўся клопат і дагляд у старасці, адпаведнага пахавання і памяці пасля смерці. Калі нехта з іх ставіўся лепш за астатніх, браў больш абавязкаў, то атрымліваў большае ўзнагароджанне. Невыкананне абавязкаў дзяцей адносна бацькоў каралася адсоўваннем ад маёмасці.

Дадзенае даследаванне ў некаторай меры запаўняе прагал па гісторыі дзяцінства ў Гародні. У большай ступені крыніцы прадстаўляюць узаемаадносіны паміж бацькамі і дзецьмі пры размеркаванні спадчыны. Пачатак жыцця, першыя крокі не апісаны ў дэталях у дакументах. Пры выяўленні новых крыніц гэтыя прагалы могуць быць запоўнены.

## REFERENCES

*Akty, izdavaemye komissieju, vysochajshe uchrezhdennoju dla razbora drevnikh aktov v Vilne* (1890). Т. 17. Вильна. [in Russian].

Ar'es, F. (1999). *Riebionok i semejnaia zhyzn' pri Starom poriadkie*. Ekaterinburg. [in Russian].

Goscieŭ, A., Kirkievich, A. (2012). Savieckaia plošča iak arhealagičny pomnik. *Haradzienski gadavik*. 1, 85–91 [in Belarusian].

75 Тамсама. Арк. 107–108.

76 НГАБ. Ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 140 адв. – 141.

77 Тамсама. Арк. 278 адв.

Gritskievich, V.P. (1987). *S fakielom Gippokrata: Iz istorii belorusskoj meditsyny*. Minsk. [in Russian].

Sliž, N. Graviura Harodni Adelhauzera-Cundta 1567—1568 gg. jak adlustravannie mižnarodnych padziej na fonie garadskoga žyccia. *Arche. Garadskaja gistoryja Belarusi*. 2, 9-105. [in Belarusian].

Sliž, N. (2009). „Zbor znakamitych cudaŭ i laskaŭ Najswiaciejšaj Panny Maryi Studenckaj jak krynica na gistoryi Hrodna. *Arhivaryus*. 7, 132–181. [in Belarusian].

Sliž, N. (2014). Zlačynstva i zlačyncy ŭ Harodni ŭ XVII st. *Arche. Garadzienski milenium*. 11, 122–182. [in Belarusian].

Sliž, N. (2010). Lava ŭ kaplicy Maci Božaj Studenckaj u farnym kasciole Harodni. *Arche. Drugaja Harodnia*. 1, 2, 66–98. [in Belarusian].

Sliž, N. (2017). Pobyt garadzienskich miaščan u XVI – peršaj palowie XVII stst. *Origines, fontes et narrationes – pośród kręgów poznania historycznego. Prace ofiarowane Profesorowi Marcelemu Antoniewiczowi w 65. rocznicę urodzin*. Częstochowa. 627–651. [in Belarusian].

Sliž, N. (2014). Tastament garadzienskaga radcy Fiodara Bahdanoviča. *Arhivaryus*. 12, 65–85. [in Belarusian].

***Natallia Slizh***
Candidate in History, associated professor,
Belarusian Law Institute, Hrodna Branch
(Belarusia, Hrodna , magvita@gmail.com)
ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9907-9761

## THE CHILDREN IN THE BURGHER' S FAMILY IN THE SIXTEENTH – SEVENTEENTH CENTURIES

The history of childhood is not presented in the historiography. Because of lack of documents it is rather complicated to analyze this topic deeply. From the point of view of the Magdeburg Law a child was a person under age of 21. The procreative function was the main function of the burgher family. Religion and the law made effort to consider legitimate children born only in a wedding marriage. A certificate of good origin needed to become an official and a member of a guild. The art in Hrodna dose not represent a lot of material in the history of childhood. Some anonymous pictures of children are kept safe from the sixteenth – seventeenth centuries. Saving materials allow make the next conclusions. Parents tried to give education to their children according with their financial position because a profession for burgher society was the main source of income. They took care about children's health and lot. Parents did all their best to rescue them in dangerous situations. Children could be fostered. The institute of guardianship also existed in burgher society. Parents' duty was to bring up children, to marry them, and to allot property. Children should take care about their parents in old age, to bury and to remember about their soul. Breach of duty to the parents was punished by disherison.

***Key words***: children, Harodnia, upbringing, education, burgher society, XVI–XVII cent.